УДК 929.52 (476)

***В.М. Папко***

# ДАВЫД-ГАРАДОЦКАЯ АРДЫНАЦЫЯ КНЯЗЁЎ РАДЗІВІЛАЎ У 1905–1939 гг.

Артыкул прысвечаны сістэме арганізацыі адной з самых вялікіх па плошчы ардынацый, якія існавалі на землях Польшчы ў перыяд паміж дзвюма сусветнымі войнамі. Гэтая ардынацыя была створана ў канцы XVI ст. Традыцыйнае права спадчыны перадавала ардынацыі старэйшаму ў родзе. У пачатку XX ст. князь Антоній-Вільгельм Радзівіл падзяліў свае ардынацыі паміж двума сынамі. Малодшаму з іх, Станіславу, дасталася Давыд-Гарадоцкая на Палессі. У 1920 г. князь загінуў, а яго ўладанні перайшлі да пляменніка, князя Караля. У 1921–1939 гг. гэтае зямельнае ўладанне налічвала каля 155 тыс. га. Зямельная рэформа, якая праводзілася польскімі ўладамі ў гэты час, не закранула ардынацыі. На Палессі было вельмі мала ворыўных земляў, большасць тэрыторыі Давыд-Гарадоцкай ардынацыі складалі балоты і лясы. Адным з важных аспектаў дзейнасці гэтай ардынацыі была арганізацыя паляванняў, у якіх часта прымалі ўдзел памешчыкі, вышэйшыя чыноўнікі дзяржавы і дыпламаты. Вясной 1939 г. улады вырашылі скасаваць ардынацыі, лічачы іх феадальным перажыткам.

## Уводзіны

Беларускі даследчык А. Грыцкевіч, абапіраючыся на акт устанаўлення радзівілаўскіх ардынацый, такім чынам акрэсліў значэнне гэтага тэрміна: «Ардынацыямі называліся феадальныя вотчыны, якія навечна пакідаліся ў валоданне мужчынскіх нашчадкаў роду Радзівілаў з парадкам перадачы ў спадчыну па прынцыпе першароднасці. Ардынацыі не пераходзілі па спадчыне жанчынам і не маглі адчужацца» [1, с. 165]. Польскі даследчык А. Мелень падае наступнае тлумачэнне паняцця ардынацыі: «Гэта прававая інстытуцыя, якая звязвае пэўны маёнтак як непадзельную цэласнасць, якая не падлягае продажу, з пэўным родам назаўсёды, прычым перадача ў спадчыну гэтага маёнтка членамі дадзенага роду наступае на ўмовах прымагенітуры (першароднасці)» [2, с. 20].

Пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора ў 1921 г. у склад Польскай дзяржавы ўвайшлі землі Заходняй Беларусі. На гэтай тэрыторыі знаходзіліся чатыры прыватнаўласніцкія ардынацыі: Роская графаў Браніцкіх (Беластоцкае ваяводства), Масалянская графаў Біспінг-Галенаў (Беластоцкае ваяводства), Нясвіжская і Клецкая князёў Радзівілаў (Навагрудскае ваяводства) і Давыд-Гарадоцкая князёў Радзівілаў (Палескае ваяводства). Самай вялікай з іх на той час была Давыд-Гарадоцкая, якая налічвала каля 155 тыс. га зямлі [3, с. 377–379].

## Заснаванне ардынацыі

Пытанне заснавання Давыд-Гарадоцкай ардынацыі гісторыкамі не даследавана. Не выяўлены пакуль што дакумент аб яе заснаванні. Вядома, што вялікі комплекс зямель на Палессі належаў князям Радзівілам ужо падчас заснавання ў 1586 г. Нясвіжскай, Клецкай і Алыцкай ардынацый. Традыцыйна гэтыя землі мелі дачыненне да Клецкай ардынацыі, хоць па плошчы значна пераўзыходзілі яе самую. Вельмі часта ў дакументах XIX ст. гэтыя ўладанні называліся асобнай ардынацыяй, але фактычна ёю не з’яўляліся. Толькі недзе ў канцы XIX – пач. XX ст. адбылося афіцыйнае прызнанне палескіх маёнткаў Давыд-Гарадоцкай ардынацыяй. Першым ардынатам стаў князь Станіслаў (1880–1920), а заснавальнікам быў яго бацька, прускі генерал князь Антоній-Вільгельм (1833–1904).

Доўгі час цэнтрам гэтай ардынацыі быў Давыд-Гарадок, адсюль пайшла і яе назва. Аднак з канца XIX ст. асноўным фальваркам сталі Манькавічы, размешчаныя вельмі блізка ад Століна (зараз тэрыторыя былой сядзібы ўваходзіць у склад горада). У 1885 г. княгіня Марыя-Дарота Радзівіл заклала ў Манькавічах парк, размешчаны на высокім беразе Гарыні. Пасля атрымання ардынацыі князем Станіславам парку ў 1905 г. быў пабудаваны палац, дзе пасялілася сям'я ардыната і знаходзілася ўпраўленне ардынацыі [4, с. 456].

У Дзяржаўным архіве Брэсцкай вобласці (далей – ДАБВ) захаваўся значны комплекс дакументаў, якія тычацца гісторыі Давыд-Гарадоцкай ардынацыі ў 1921–1939 гг. Вядома, аднак, што частка спраў з гэтага комплексу (іх назвы захаваліся ў вопісах) была страчана ў 1950-я гг. Прычыну высветліць не атрымалася. Магчыма, гэта былі прыватныя дакументы роду. Зразумела, што большасць іх мела дачыненне да тых часоў, калі ў Манькавічах была пабудавана рэзідэнцыя. Большая частка дакументаў знаходзіцца ў фондзе 2031. Гэта судовыя справы Акруговага суда ў г. Пінску, які разглядаў пытанні, звязаныя з падзелам спадчыны князя Станіслава, маёмасці яго родзічаў. Добра ў брэсцкім архіве прадстаўлена дакументацыя, якая тычыцца лясной гаспадаркі ў ардынацыі. У ДАБВ захаваліся таксама справы, прысвечаныя атрыманню членамі сям'і апошняга ардыната князя Караля замежных пашпартоў, якія былі патрэбны для выезду з Польшчы. У гэтых справах захаваліся і самі пашпарты са здымкамі.

У судовых справах захавалася шмат дакументаў ранейшага перыяду, якія дазваляюць аднавіць многія юрыдычныя пытанні ў гісторыі ардынацый пачынаючы ад смерці кн. Антонія-Вільгельма ў 1904 г. У прыватнасці, захавалася копія завяшчання князя Антонія-Вільгельма, якое дазваляе ўявіць у поўнай ступені тую маёмасць, што належала роду ў пачатку XX ст. Завяшчанне прадугледжвала раздзяленне ардынацый паміж сынамі Ежы і Станіславам. У адпаведнасці з § 5 гэтага завяшчання, «мой младший сын Станислав имеет при разделе получить майоратное (ординационное) имение Давидгрудек, а именно с его составными частями как равно и со всеми принадлежностями, предназначенными служить хозяйственным целям имения, т.е. с мёртвым и живым инвентарём, все как будет находится в момент моей смерти, в особенности также с существующими в момент моей смерти связанными с этой недвижимостью и из оной вытекающими выкупными капиталами, но с обязательством принять на себя нераздельное несение и удовлетворение всех лежащих на означенной недвижимости или иных долговых обязательств, всякого рода происходивших от ведения хозяйства, записаны ли они за ними или нет и всех этих обязательств в том виде, как они будут существовать в момент моей смерти» [5, арк. 8–8адв.].

У завяшчанні таксама згадвалася, што князь Станіслаў атрымлівае ад бацькі частку яго рухомай спадчыны: карціну з двума хлопчыкамі, якія спяць (прыпісвалася Рубенсу), партрэт караля Генрыха IV Французскага, копію партрэта польскай каралевы Барбары, які захоўваецца ў Нясвіжы. Фактычна гэтыя карціны сталі часткай маёмасці Давыд-Гарадоцкай ардынацыі. Пры гэтым князь Станіслаў быў абавязаны выплачваць 1/3 частку пенсіі маці і платы за яе кватэру ў Берліне. Гэтае завяшчанне было складзена ў Берліне 6 чэрвеня 1902 г. і зацверджана Акруговым судом г. Мінска 20 ліпеня 1905 г. На той момант Давыд-Гарадоцкая ардынацыя знаходзілася ў межах Пінскага і Мазырскага паветаў Мінскай губерні [5, арк. 1–1адв., 9адв.].

### Гаспадарчая дзейнасць князя Станіслава (1905–1920 гг.) і падзел яго спадчыны

Да 1915 г. становішча ардынацыі было даволі стабільным. Нягледзячы на тое, што краіна знаходзілася ў стане ваенных дзеянняў, тэатр іх быў далёка. Аднак з набліжэннем фронту расійскія ўлады загадалі эвакуіраваць насельніцтва і вывозіць

найбольш каштоўныя прадпрыемствы. Падчас Першай сусветнай вайны, рэвалюцый і савецка-польскай вайны становішча было нестабільным, перавага знаходзілася то на адным, то на другім баку. Відаць, з гэтай прычыны князь Станіслаў, не ўпэўнены ў будучым, няшчадна эксплуатаваў лясы ардынацыі. Ён заключыў некалькі дамоўленасцей на вырубку і вываз лесу з фірмамі і прыватнымі асобамі. Грошы з гэтых здзелак ён браў авансам і ўкладваў у кіеўскія банкі, набываў нерухомасць у Кіеве і Варшаве. Аднак палітычныя калізіі не далі цалкам рэалізаваць гэтыя здзелкі, грошы, з іх атрыманыя, былі страчаны пасля заключэння Рыжскага міру.

28 красавіка 1920 г. князь Станіслаў (поўнае імя Вільгельм-Януш-Генрык-Станіслаў) загінуў на поле бітвы з бальшавікамі. Ён быў маёрам польскага войска. У князя Станіслава была жонка Марыя-Далорэс (1886–1966) з роду Радзівілаў і адзіная дачка Ганна (1907–?). Акт заснавання ардынацыі патрабаваў перадачу асноўнай часткі спадчыны князя Станіслава – Давыд-Гарадоцкай ардынацыі – бліжэйшаму родзічу па мужчынскай лініі. Князь Станіслаў меў трох родных пляменнікаў, сыноў яго старэйшага брата Ежы – Альбрахта (1885–1935), Караля (1886–1968) і Леона (1888–1959). Альбрахт з 1914 г. пасля смерці бацькі з’яўляўся нясвіжскім і клецкім ардынатам. З прэтэнзіяй на спадчыну князя Станіслава звярнуўся толькі сярэдні пляменнік Караль, які на той момант служыў сувязным афіцэрам у Генеральным штабе пры англійскай місіі [5, арк. 1–3].

Атрыманне Каралем ардынацыі адбылося ў абыход правілаў, закладзеных у акце заснавання ардынацыі, таму што ён не быў старэйшым родзічам-мужчынам. Аднак статут даваў ардынату права выбраць сабе пераемніка, таму значным аргументам пры такім падзеле спадчыны было жаданне самога князя Станіслава, якое ён занатаваў у завяшчанні. Гэты дакумент захоўваўся ў Пецярбургу і быў у 1920 г. недаступны. Аднак усе зацікаўленыя бакі ведалі змест завяшчання і з ім пагаджаліся: ардынацыя князю Каралю, усё астатняе – дачцэ і жонцы [6, арк. 1]. Князь Альбрахт падтрымаў брата: 21 лютага 1920 г. у Парыжы ён падпісаў афіцыйны дакумент, якім адмаўляўся ад прэтэнзій на Давыд-Гародоцкую ардынацыю [5, арк. 29].

Пры зацвярджэнні новага ардыната кнзгіня Ізабэла, жонка князя Караля, якая была яго даверанай асобай (князь знаходзіўся ў войску), 7 ліпеня 1920 г. дала пісьмовае абавязальніцтва жонцы папярэдняга ардыната, сваёй роднай сястры Марыі-Далорэс, выплаціць ёй на працягу 10 гадоў з даходаў ардынацыі значную суму грошай. Зыходзячы з гэтай дамоўленасці, Марыя-Далорэс з дачкой абяцалі не прэтэндаваць на маёмасць ардынацыі (на гэта яны і не мелі права). Аднак гэта быў вельмі нестабільны час, калі існавала верагоднасць, што ардынацыі наогул скасуюць. Кнзгіня Ізабэла брала на сябе і мужа вельмі жорсткія абавязкі: «У выпадку скасавання ардынацыі і адчужэння зямлі і лясоў без кампенсацыі, сумы, выплачаныя на падставе дадзенага абавязальніцтва звароту, не падлягаюць» [6, арк. 4]. Таксама давалася абяцанне адразу пасля атрымання ардынацыі князем Каралем скласці завяшчанне, у якім будзе названы наступны ардынат, згодны выканаць абавязкі князя Караля ў выпадку яго смерці.

Княгіня Марыя-Далорэс сцвярджала, што ў 1914 г. уклала ў касу ардынацыі 200 тыс. руб. свайго пасагу ў якасці інвестыцый. Акрамя гэтага, княгіні і яе дачцэ Ганне належала сума ў 2,5 млн. швейцарскіх франкаў адпаведна статуту ардынацыі. Наследніцы патрабавалі выплаціць ім агульную суму ў 3 млн. франкаў.

Праз некаторы час высветліўся сапраўдны стан фінансаў ардынацыі, які склаўся ў выніку апошніх гадоў гаспадарання князя Станіслава, узніклі значныя праблемы з выплатай абяцаных княгіні Марыі-Далорэс грошай. Князь Караль абвінавачваў свайго дзядзьку-нябожчыка ў злоўжываннях, якія прымушалі цяпер выцягваць ардынацыю з эканамічнай ямы. Сцвярджалася, што толькі на працягу 1916–1917 г. дзядзька прадаў амаль 2 млн. адборных дрэў на суму каля 10 млн. руб., грошы браў авансам. Па гэтай

прычыне Караль быў вымушаны дамовіцца з уладальнікам самага вялікага і найменш выгаднага дагавора Леонам Бродскім і дазволіў яму эксплуатаваць лясы ардынацыі з тым, што той згодзіцца ануляваць дагавор з князем Станіславам на суму 250 млн. марак. Ён таксама абавязваўся за 50 млн. марак урэгуляваць прэтэнзіі ўсіх астатніх прэтэндэнтаў на лес [6, арк. 32].

Такім чынам, пасля смерці князя Станіслава ардынацыя аказалася абцяжаранай нявыгаднымі здзелкамі, ад якіх было немагчыма адмовіцца, таму што грошы былі ўжо атрыманы. Пры гэтым фінансавай карысці для ардынацыі здзелкі не прынеслі. У выпадку, калі грошы не былі б страчаны, яны б належалі не ардынацыі, а дачцэ князя Станіслава Ганне. Фінансавая сітуацыя ў Давыд-Гарадоцкай ардынацыі была вельмі складанай. Гэта стала прычынай канфлікту паміж новым ардынатам князем Каралем і сям’ёй папярэдняга ардыната – яго жонкай і дачкой.

Праз год пасля смерці мужа Марыя-Далорэс выйшла замуж за свайго дваюраднага брата Леона Радзівіла (1880–1927), пераехала з дачкой у Парыж, дзе і жыла пастаянна. Увесь час, пакуль цягнуўся судовы працэс, справа ўскладнялася якраз тым, што абодва бакі жылі ў розных краінах, дзейнічалі праз адвакатаў і консульствы. Быў нават выпадак, калі падчас візіту князя Караля ў Парыж княгіня Марыя-Далорэс спрабавала ўздзейнічаць на яго праз французскі суд [6, арк. 30–30адв.].

**Лясная гаспадарка ардынацыі**

Большасць плошчы ардынацыі складаў лес, што абумовіла спецыфіку яе ўпраўлення. На працягу некалькіх стагоддзяў гаспадарання Радзівілаў у гэтым рэгіёне склаліся некаторыя традыцыі. Мясцовае насельніцтва вельмі цесна залежала ад промыслаў, звязаных з лесам. Адной з крыніц даходаў мясцовага насельніцтва быў удзел у паляваннях у якасці загоншчыкаў (удзельнічалі сотні людзей). Не было рэдкай з’явай і браканьерства на землях ардынацыі, дзе мясцовыя жыхары здаўна прывыклі паляваць у панскіх лясах. Сустракаецца шмат судовых спраў аб браканьерстве.

У 1921–1939 гг. Давыд-Гарадоцкая ардынацыя была самым вялікім лясным маёнткам на тэрыторыі Столінскага павета, дзе ўсяго было 101,201 га лясоў, з іх 60 тыс. 947,97 га (60 %) складалі лясы ардынацыі. Княгіня Марыя-Далорэс Радзівіл валодала ў гэтым павеце маёнткам Старое Беражное, у якім было 418 га. Усяго ў той час у павеце было 34 лясныя маёнткі, якімі валодалі прыватныя асобы і фірмы [7, арк. 74–75].

У 1923 г. польскі ўрад прыняў закон аб увядзенні абавязковых падаткаў на лес, што асабліва закранула інтарэсы буйных лесапрамыславікоў. Прычынай увядзення гэтага падатку было цяжкае становішча ў будаўнічай гаспадарцы краіны, разбуранай дзвюма войнамі. Спецыяльная камісія з прадстаўнікоў мясцовых павятовых улад (у склад яе ўваходзіў і камісар аховы лясоў) вызначала памер ляснога падатку. Ардынацыя размяшчалася ў 5 гмінах: Хорскай, Столінскай, Плотніцкай, Церабяжоўскай і Бярозаўскай [8, арк. 13–15адв.] Лес ардынацыі падзяляўся на дзялянкі – Стралецкую, Веляміцкую, Турска-Лядскую, Юзэфінскую, Старасельскую, Перабродскую, Вікаравіцкую, Рубельскую, Атвержыцкую і Арлоўскую [9, арк. 8].

Пытаннем збору ляснога падатку займаўся камісар аховы лясоў і рэферэнт па справах ляснога падатку [8, арк. 50]. Князь Караль быў вымушаны выканаць умовы кантрактаў, падпісаных яго дзядзькам. 4 лістапада 1921 г. Караль Радзівіл аформіў продаж усіх надзелаў ардынацыі пад вырубку лесу на 25 гадоў бюро Леона Бродскага. Гэтае прадпрыемства павінна было плаціць і лясны падатак: частку драўнінай (1 600 м$^3$ сасны), частку грашыма (41 тыс. 571 марку) [8, арк. 15адв.–17, 31, 38]. Лес ардынацыі перапрацоўвалі на лесапільнях ў Юзэфіне і Дамброве, для перавозкі драўніны выкарыстоўвалася прыватная вузкакалейка Радзівілаў.

**Рыбная гаспадарка**

У пачатку 1930-х гг. з сямі былых фальваркаў Давыд-Гарадоцкай ардынацыі непасрэдна прамысловая вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі засталася толькі на двух – Долін (быў так названы ў гонар княгіні Марыі-Далорэс, якую ў сям'іназывалі Далорэс або Долі)і Дамброва. Астатнія былі аддадзены або пад вайсковае асадніцтва, або падпалі пад дзеянне аграрнай рэформы [10, арк. 1адв.]. Неабходна прызнаць, што ніколі за ўсю гісторыю ардынацыі тут не было такога актыўнага гаспадарчага руху, як у апошняе дваццацігоддзе яе існавання. Прычына заключалася ў тым, што амаль увесь час гэта былі другарадныя маёнткі ў цяжкадаступным рэгіёне. Аднак з пачатку XX ст. тут існавала рэзідэнцыя князя, у якога не было іншых уладанняў. Да таго ж будаўніцтва чыгункі зрабіла больш лёгкай і прыбытковай эксплуатацыю лесу.

У 1930-я гг. князь Караль актыўна развіваў на тэрыторыі ардынацыі рыбную гаспадарку. Было пабудавана некалькі прамысловых сажалак, дзе вырошчвалася рыба, якую на продаж вывозілі чыгункай. Ствараліся і сажалкі для зімавання рыбы. У 1933 г. спецыяльная камісія ў складзе ваяводскага рыбнага інспектара М. Савіцкага ў прысутнасці тагачаснага кіраўніцтва ўпраўлення ардынацыі – прадстаўніка ардыната Е. Сянькоўскага, дырэктара ардынацкіх лясоў Р. Дабравольскага, дырэктара ардынацкіх рыбалавецтваў Я. Рослера – даследавала ўсе рыбныя сажалкі ардынацыі: яны былі абмераны і падрабязна апісаны. Высветлілася, што ў той час у маёнтках князя Караля існавала 35 сажалак агульнай плошчай 474,5 га, будавалася яшчэ 2 сажалкі плошчай 210 га. У паўночнай частцы Перабродскай дзялянкі функцыянавала рыбная гаспадарка «Млынішча» плошчай 215 га. Існаваў праект пабудаваць паласу рыбных сажалак шырынёй да 6 км і даўжынёй 20 км [9, арк. 8, 13–14, 29–30].

**Ажыццяўленне аграрнай рэформы**

28 снежня 1925 г. Сейм ухваліў галоўны закон аб правядзенні аграрнай рэформы. Памешчыкі былі вымушаны прадаваць землі, якія перавышалі 300 га. Закон дазваляў гаспадарам маёнткаў самім вырашаць, якія землі аддаць пад парцэляцыю. Зямля прадавалася па рыначных цэнах, што спрыяла фінансавай стабілізацыі памешчыцкіх гаспадарак і дазваляла ўкладваць грошы ў мадэрнізацыю. Такі падыход да правядзення аграрнай рэформы атрымаў добры водгук сярод памешчыкаў, у выніку чаго за перыяд 1918–1938 гг. было распарцэлявана 1 млн. 863 тыс. га прыватных зямель. На думку польскага гісторыка А. Ліхаровіча, гэтая аграрная рэформа ў Польшчы была «рацыянальнай спробай эвалюцыйнага правядзення аптымальнай – у межах існаваўшых эканамічных магчымасцей сельскай гаспадаркі і фінансавых дзяржавы – карэктуры ладу і структуры польскай вёскі» [11, с. 29]. Працэс ажыццяўлення аграрнай рэформы адбываўся не вельмі хутка. Адной з прычын гэтага можна лічыць недахоп сродкаў у мясцовага насельніцтва на куплю зямель. Асноўнай задачай рэформы быў продаж памешчыцкіх зямель мясцовым жыхарам (такая парцэляцыя называлася «суседскай»).

Адпаведна статуту ардынацыі, землі яе не падлягалі продажу. Аднак структура ардынацкіх зямель не была аднароднай: сярод іх сустракаліся сялянскія надзелы. Таму ішоў актыўны працэс абмену надзеламі паміж князем і сялянамі, каб пазбавіцца цераспалосіцы. Сяляне захавалі за сабой частку правоў яшчэ з часоў адмены прыгоннага права (сервітуты, служэбнасці і г.д.). Дакументы сцвярджаюць, што парцэляцыя на землях ардынацыі ажыццяўлялася не вельмі актыўна. На жаль, па тых дакументах, якія захаваліся ў ДАБВ, цяжка зрабіць выснову, якім чынам выбіраліся землі пад парцэляцыю.

Эканамічныя і прававыя адносіны ардынацыі з сялянамі былі даволі заблытанымі. Напрыклад, жыхары в. Альманы Столінскага павета адпаведна іменнаму спісу ў 1868 г. мелі 1668,23 га зямлі ў надзелах; акрамя гэтага, мелі права выпасу летам жывёлы па лясах і балотах гаспадара маёнтка, а вясной па лугах [9, арк. 39]. Такі стан спраў быў вельмі нязручным для землекарыстання, таму што ствараў умовы для злоўжыванняў (патравы і г.д.). У пачатку 1930–х гг. былі ўведзены абмежаванні гэтага права.

Лес не трапляў пад дзеянне рэформы, а ён складаў асноўную частку ардынацыі. Менавіта таму князь Караль імкнуўся атрымаць дазвол на парцэляцыю асобных участкаў лесу. Паводле афіцыйных звестак, у межах ардынацыі знаходзілася 27 вёсак: Альманская Кашара, Альманы, Альшаны, Атвержыцы, Белавуша, Бярозаў, Блажова, Велемічы, Вежыца, Вялікае Малешава, Вялікія Арлы, Гліннае, Драздынь, Лядзец, Малыя Арлы, Манькавічы, Мачуль, Альпень, Пераброды, Пераходзічы, Рубель, Старое Сяло, Харомск, Хотамель, Хорск [9, арк. 52].

Ставілася задача арганізацыі пакупкі жыхарамі гэтых вёсак зямель Караля Радзівіла. Аднак гэты працэс ішоў вельмі павольна. У планах часта адзначалася, што актыўнасць з боку мясцовых пакупнікоў адсутнічае. На жаль, дадзеных на канец 1930-х гадоў няма, таму невядома, якія з праектаў парцэляцыі ўдалося ажыццявіць.

У Атвержыцкай дзялянцы існаваў праект парцэляцыі на 270 га, у асноўным гэта быў лес. У Рубельскай дзялянцы ўпраўленне ардынацыі прасіла дазвол на вырубку лесу каля 229 га – пад парцэляцыю. На Старасельскай дзялянцы былі анклавы зямлі сялян вёсак Пераброды і Вежыца, ішоў працэс іх ліквідацыі. Тут пад парцэляцыю было адведзена два надзелы (516 га і 577 га), дзе быў лес і балотныя лугі. Гэтыя землі прадаваліся на парцэляцыю не за грошы, а за адпрацоўку пры будаўніцтве рыбных сажалак. Месца будаўніцтва знаходзілася за 6–8 км ад зямель, якія ішлі пад парцэляцыю [9, арк. 42–44].

З фінансавых дакументаў відаць, што Давыд-Гарадоцкая ардынацыя не была прыбытковым прадпрыемствам. Значным багаццем былі лясы, продаж драўніны складаў значную частку прыбытку. У першай палове 1930-х гг. большасць прыбытку давала рыбная гаспадарка, меншую – продаж надзелаў пад парцэляцыю [9, арк. 59].

**Супрацоўнікі ардынацыі**

У 1920-х гг. у Польшчы было ўведзена абавязковае страхаванне здароўя некаторых катэгорый наёмных работнікаў. Страхаванне гэтае ажыццяўлялася павятовымі касамі хворых, а плаціць быў абавязаны работадаўца. У лютым 1929 г. камісар павятовай касы хворых у г. Століне прыняў рашэнне аб штрафных санкцыях у дачыненні да Караля Радзівіла, які не застрахаваў 17 пастаянных супрацоўнікаў упраўлення Давыд-Гарадоцкай ардынацыі. Князя Радзівіла абавязалі заплаціць у касу 44 тыс. 73 зл. 60 гр. Гэтая сума складалася са ўзносаў, якія не былі заплачаны за работнікаў з моманту пачатку іх працы ў ардынацыі.

На тэрыторыі ардынацыі працавала некалькі прадпрыемстваў: лесапільні ў Дамброве і Юзэфіне, вузкакалейка, вінакурны завод у Манькавічах. Адбылося некалькі судовых разбіральніцтваў па гэтай справе, у якіх перамог Караль Радзівіл. Сам па сабе гэты факт не меў вялікага значэння для гісторыі ардынацыі, аднак судовая справа паміж касай хворых і князем Каралем захавала поўны спіс супрацоўнікаў ардынацыі з сумай іх заробку і пасадай, якую яны займалі [12, арк. 1–1адв., 3, 5–6, 60–61].

Табліца – Супрацоўнікі Галоўнага ўпраўлення Давыд-Гарадоцкай ардынацыі ў 1929 г.

| | Прозвішча і імя | Пасада ў ардынацыі | З якога года працуе | Заробак, зл. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Альшанскі Здзіслаў | тэхнік вінакурні ў Манькавічах | 1928 | 337 |
| 2 | Банькоўскі Васіль | пляцоўшчык пры лесапільні ў Юзэфіне | 1928 | 100 |
| 3 | Вітрук Мікалай | кіраўнік лесапільні ў Юзэфіне | 1925 | 265 |
| 4 | Гавенка Юзаф | машыніст вузкакалейкі | 1925 | 175 |
| 5 | Гарадзецкі Уладзімір | зменшчык на лесапільні ў Юзэфіне | 1928 | 165 |
| 6 | Жаброўскі Антон | кіраўнік лесапільні ў Дамброве | 1925 | 510 |
| 7 | Кухарэвіч Аляксандр | рахункавод на лесапільні ў Дамброве | 1925 | 220 |
| 8 | Лазарэвіч Антон | лесапільня ў Дамброве* | 1924 | 170 |
| 9 | Ліпкоўскі Валерый | дырэктар лесапільні ў Юзэфіне | 1925 | 395 |
| 10 | Ружуцкі Яўген | зменшчык на лесапільні ў Юзэфіне | 1927 | 215 |
| 11 | Сухоцкі Ян | пляцоўшчык лесапільні ў Дамброве | 1925 | 120 |
| 12 | Тымчук Ян | машыніст вузкакалейкі | 1925 | 145 |
| 13 | Фіялкоўскі Ян | маніпулянт драўніны на лесапільні ў Дамброве | 1925 | 216 |
| 14 | Шаўчук Юрый | кандуктар чыгункі ў Дамброве | 1924 | 125 |
| 15 | Шустэр Юзаф | пляцоўшчык пры лесапільні ў Юзэфіне | 1928 | 90 |
| 16 | Цэцэрскі Антон | дарожны наглядчык на вузкакалейцы | 1925 | 145 |
| 17 | Цэцэрскі Мікалай | абслугоўваў вузкакалейку | 1925 | 100 |

**Сям'я і лёс апошняга ардыната**

З 1933 г. князь Караль разам з сям'ёй пасяліўся ў Манькавічах. Яго жонкай была княгіня Ізабэла (1890–1968), дачка князя Дамініка Радзівіла і Далорэс дэ Аграмонтэ. У Караля і Ізабэлы была адзіная дачка Ізабэла (1915–1996), якая ў 1934 г. выйшла замуж за далёкага родзіча князя Эдмунда Радзівіла (1906–1971) [4, с. 458–459].

Па звестках усепольскага перапісу насельніцтва, у 1931 г. у фальварку Манькавічы разам з гаспадарамі маёнтка жыло 123 чалавекі, там знаходзілася 12 будынкаў (у тым ліку палац) [4, с. 459]. Да нашых дзён захаваўся спіс выбаршчыкаў у Сейм і Сенат, складзены ў 1938 г. Князь-ардынат і яго жонка размешчаны ў спісе сярод сялян, якія жылі ў вёсцы і сядзібе, у алфавітным парадку. Цікава, што ў графе «прафесія» насупраць прозвішча князя пазначана «ардынат». Гэты спіс дазваляе выявіць некаторых спецыялістаў і работнікаў, якія жылі ў Манькавічах і працавалі ў маёнтках ардынацыі [13, арк. 1 адв.–56].

---

*Пасада не вядома.

Вясной 1939 г. польскія ўлады афіцыйна скасавалі тытулы і ардынацыі, што павінна было аздаравіць эканоміку. Лёс сям'і апошняга ардыната пасля верасня 1939 г. быў даволі складаным. З пачаткам Другой сусветнай вайны князь Караль і яго жонка княгіня Ізабэла разам з польскімі войскамі хацелі трапіць у Румынію, аднак былі арыштаваны і апынуліся ў савецкім лагеры для ваеннапалонных. Пасля вызвалення з лагера ў 1942 г. сям'я праз Англію трапіла ў Паўночна-Афрыканскую рэспубліку, дзе яны доўгі час займаліся гадаваннем курэй. Апошнія гады свайго жыцця правялі ў Польшчы, дзе і памерлі ў адзін год – княгіня Ізабэла 21 лютага 1968 г., а князь Караль – 24 кастрычніка. Княгіня Ізабэла-малодшая з сям'ёй мужа знаходзілася некаторы час у ссылцы ў СССР, потым жыла ў Варшаве, працавала ў бібліятэцы Варшаўскага ўніверсітэта [4, с. 461].

Адна з унучак княгіні Ізабэлы-малодшай Марыя-Ганна працягнула традыцыю сваёй бабулі і прабабулі і выйшла замуж за прадстаўніка роду Радзівілаў Мацея. Гэтая сям'я актыўна дапамагае Нацыянальнаму гісторыка-культурнаму музею-запаведніку «Нясвіж» у пошуку за межамі Беларусі матэрыялаў і экспанатаў, прысвечаных гісторыі роду і яго ўладанняў.

**Заключэнне**

Прыватнаўласніцкія ардынацыі ў Польшчы ў 1921–1939 гг. апынуліся ў новых эканамічных і палітычных умовах. З аднаго боку, дзяржава імкнулася захаваць ардынацыі, таму яны не трапілі пад дзеянне аграрнай рэформы 1925 г. і іх слаба закранула парцэляцыя. З іншага боку, дзяржава пачала браць з іх падаткі, чаго не было ў часы Расійскай імперыі. У 1923 г. уладальнік Давыд-Гарадоцкай ардынацыі быў вымушаны заплаціць новы лясны падатак. У параўнанні з папярэднімі часамі правы ардыната ў карыстанні маёнткамі былі больш абмежаваны. У штодзённае жыццё пачалі ўваходзіць прывычныя нам зараз дасягненні сацыяльна арыентаванага грамадства, у прыватнасці страхаванне здароўя працаўнікоў, што прымушала гаспадароў выдаваць на гэта частку даходаў.

Пасля смерці князя Антонія-Вільгельма Давыд-Гарадоцкая ардынацыя перайшла ў спадчыну яго малодшаму сыну князю Станіславу, які загінуў у 1920 г. Яго пераемнік князь Караль быў вымушаны выконваць абязальніцтвы, зробленыя дзядзькам, што значна падарвала фінансавы стан ардынацыі. На працягу гэтага перыяду значна змянілася структура даходаў ардынацыі. У пачатку 1920-х гг. яны браліся пераважна за кошт эксплуатацыі лясоў. У наступнае дзесяцігоддзе асноўны даход пачало прыносіць развядзенне рыбы, у меншай ступені – эксплуатацыя лесу і продаж зямельных надзелаў па ўмовах аграрнай рэформы 1925 г.

У канцы дадзенага перыяду дзяржаўныя ўлады прыйшлі да высновы аб неабходнасці скасавання ардынацый, што і адбылося вясной 1939 г. Прадугледжаныя ўладамі меры не былі рэалізаваны, таму што праз некалькі месяцаў пачалася Другая сусветная вайна. Землі Давыд-Гарадоцкай ардынацыі ўвайшлі ў склад БССР і былі нацыяналізаваны. Палац Радзівілаў у Манькавічах пацярпеў падчас Другой сусветнай вайны, у 1960-я гг. яго руіны былі канчаткова разабраны. Давыд-Гарадоцкая ардынацыя перастала існаваць як прамысловае шматфункцыянальнае аграрнае прадпрыемства з цэлым комплексам сацыяльна-культурных адносін, што склаліся ў гэтым рэгіёне на працягу некалькіх стагоддзяў.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Грицкевич, А.П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. (социально-экономическое исследование истории городов) / А.П. Грицкевич. – Минск : Наука и техника, 1975. – 248 с.
2. Mełeń A. Ordynacje w dawnej Polsce / A. Mełeń // Pamiętnik historyczno-prawny / pod. red. P. Dąbkowskiego. – T. 7, zeszyt 2. – Lwów, 1929. – 62 s.
3. Roszkowski, W. Gospodarcza rola większej prywatnej własności ziemskiej w Polsce 1918–1939 / W. Roszkowski. – Warszawa, 1986. – 431 s.
4. Вабищевич, А. Усадьба Радзивиллов в Маньковичах / А. Вабищевич // Radziwiłłowie. Obrazy literackie. Biografie. Świadectwa historyczne / red. K. Stępniak. – Lublin : Wyd-wo Uniwersytetu M. Corie-Skłodowskiej, 2003. – S. 455–463.
5. Дело об утверждении права собственности на землю и недвижимое имущество (Радзивилл Вильгельм и др.) (1921–1924 гг.) // Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд 2031. – Воп. 2. – Спр. 86.
6. Дело о взыскании долговых сумм Радзивилл Марии-Долорес (1928–1930 гг.) // ДАБВ. – Фонд 2031. – Воп. 2. – Спр. 2568.
7. Указания Полесского воеводского управления и переписка с ним об охране лесов, списки владельцев леса (1923 – 1927 гг.) // ДАБВ. – Фонд 2003. – Воп. 6. – Спр. 3.
8. Руководящие указания Министерства общественных работ, протоколы заседаний комиссии староства о сборе лесного налога и списки владельцев лесных массивов Столинского повета (1923 г.) // ДАБВ. – Фонд 2003. – Воп. 1. – Спр. 320.
9. Дело о ликвидации сервитутов в Давид-Городокском родовом имении Кароля Радзивилла гмины Давид-Городок Столинского повета за 1933 г. // ДАБВ. – Фонд 60. – Воп. 1. – Спр. 1259.
10. Дела по жалобам на незаконные действия судебных исполнителей (Радзивилл Кароль) (1932–1933 гг.) // ДАБВ. – Фонд 2031. – Воп. 2. – Спр. 5934.
11. Lichorowicz, A. Polskie reformy rolne 1920–1944 a ziemiaństwo // Dziedzictwo. Ziemianie polscy i udział ich w życiu narodu. – Kraków : Znak, 1995. – C. 85–97.
12. Дело по иску помещика Радзивилла Карла к Столинской больничной поветовой кассе о деньгах в сумме 44 073 зл. 60 гр. (1929–1930 гг.) // ДАБВ. – Фонд 2031. – Воп. 2. – Спр. 4222.
13. Списки избирателей в Сейм и Сенат избирательного округа № 55 Столинского повета (1938 г.) // ДАБВ. – Фонд 2003. – Воп. 6. – Спр. 920.



***Papko V.M.*** **David-Gorodok Ordination of the Radzivill Princes**

The article is devoted to the organization's system of one of the greatest majorats, which existed in Poland between two world wars. This majorat has been created in the end of XVI century. Traditionally the senior man of the family received the majorat as a heritage. At the beginning of XX century prince Antony-Wilhelm Radzivill divided his majorats between two sons. The youngest from them, Stanislav, has got David-Gorodok majorat in Polesje. In 1920 the prince was killed and his majorats were given to his nephew prince Karol. In 1921–1939 this ground possession totaled about 155 thousand ha. At this time the Polish government provided the land reform, but it hasn't mentioned to majorats. The biggest part of the majorat's territory consisted from the bogs and woods. In the spring of 1939 the Polish government decided to cancel majorats, as a feudal vestige.


Рукапіс паступіў у рэдкалегію 20.04.2011